УДК 811.161.3’276.6:378.147

# МАГЧЫМАСЦІ ПРАЕКТНАГА НАВУЧАННЯ ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ КАМУНІКАТЫЎНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ СТУДЭНТАЎ ТЭХНІЧНЫХ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЕЙ У ПРАЦЭСЕ ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ ПРАФЕСІЙНАЙ ЛЕКСІКІ

Т.П. Гуліцкая
*Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт», г.Мінск*

Тэндэнцыі і дынаміка змяненняў прафесійнай сферы фарміруюць новы погляд на кампетэнтнасны падыход у сістэме вышэйшай адукацыі ў адпаведнасці з сучаснымі патрабаванням. Усе больш значную ролю набываюць гнуткія навыкі, якім неабходна надаваць большую ўвагу ў працэсе навучання [1]. Камунікатыўная кампетэнцыя, з’яўляючыся складнікам універсальных кампетэнцый, становіцца запатрабаванай сярод студэнтаў негуманітарных ВНУ. Адукацыйнымі стандартамі прадугледжана развіццё ўніверсальных кампетэнцый, у тым ліку авалоданне навыкамі пабудовы эфектыўнай маўленчай камунікацыі на беларускай мове для паспяховага рашэння задач у прафесійнай і сацыякультурнай сферах.

Вывучэнне дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» садзейнічае не толькі развіццю камунікатыўнай кампэтэнцыі, але і выступае сродкам павышэння прафесійнай кампетэнтнасці будучых спецыялістаў. Разам з тым, большасць студэнтаў адчуваюць цяжкасці камунікацыі на беларускай мове , што праяўляецца ў нізкай маўленчай культуры, няздольнасці падтрымліваць прафесійныя зносіны, наяўнасці вялікай колькасці маўленчых і граматычных памылак у пісьмовым і вусным маўленні.

У пэўнай ступені вырашэнню азначанай праблемы можа садзейнічаць арганізацыя праектнай дзейнасці як аднаго з перспектыўных напрамкаў сучаснага адукацыйнага працэсу па авалоданні аператыўнымі ведамі. Яна ўяўляе сабой творчую вучэбную работу па рашэнні практычнай задачы, мэты і змест якой вызначаюцца студэнтамі і ажыццяўляюцца імі ў працэсе тэарэтычнай прапрацоўкі і практычнай рэалізацыі пры кансультацыі выкладчыка. Праектная дзейнасць уключае ў сябе сукупнасці творчых, даследчых, праблемных, пошукавых метадаў. У яе аснове ляжыць развіццё пазнавальных навыкаў, крытычнага і творчага мыслення, уменняў самастойна канструяваць свае веды, арыентавацца ў інфармацыйнай прасторы [2, с. 26]. Распрацоўваючы і рэалізуючы праекты, студэнты развіваюць навыкі мыслення, пошуку інфармацыі, аналізу, прыняцця рашэнняў, самастойнай працы і працы ў групах. Такім чынам

адбываецца пераход ад атрымання гатовых ведаў да іх самастойнага пошуку.

Для дзейснага, граматнага выкарыстання праектнага навучання неабходна прадугледзець сістэму камунікатыўных заданняў, стварыць максімальна спрыяльныя ўмовы для раскрыцця і праяўлення творчага патэнцыялу студэнтаў, абраць адпаведную форму рэалізацыі – індывідуальную ці групавую. Арганізацыя праектных груп адбываецца рознымі спосабамі, пры гэтым неабходна ўлічыць псіхалагічную сумяшчальнасць, дыферэнцыраваны і індывідуальны падыход да яе ўдзельнікаў, а пры вызначэнні заданняў для кожнай групы ўлічваць характар саміх праектаў (рэфератыўны, даследчы, творчы). Менавіта ў гэтым і праяўляецца асобасна арыентаваны аспект праектнай дзейнасці.

Адрозныя па дамінантных тыпалагічных прыкметах, праекты дазваляюць вырашаць розныя задачы. Навукова-даследчыя праекты, як правіла, становяцца асновай для далейшай навукова-даследчай дзейнасці студэнтаў. Вынікам такіх праектаў могуць стаць кароткія тэрміналагічныя слоўнікі па спецыяльнасць, даследаванне прафесійнай лексікі пэўнай спецыяльнасці, розных тэрмінасістэм і інш.

Інфармацыйныя праекты з поспехам могуць быць прапанаваны пры вывучэнні гісторыі беларускай тэрміналогіі, падрыхтоўцы вусных выступленняў па азначанай тэматыцы і інш., а ў далейшым могуць быць інтэграваныя ў даследчыя («Структура і ўтварэнне эканамічных тэрмінаў», «Безыквівалентная лексіка беларускай мовы», і г.д).

Разнастайнасць форм творчых праектаў дазваляе рэалізавацца кожнаму ўдзельніку праекта. Неабходна адзначыць, што ўсе тэмы творчых праектаў стасуюцца з мэтамі засваення дысцыпліны. Так, пры вывучэнні функцыянальных стыляў маўлення магчыма прапанаваць групавыя творчыя праекты па стварэнні рэкламнага прадукту, звязанага так ці інакш з будучай прафесійнай дзейнасцю, пры гэтым студэнтам неабходна прыдумаць канцэпцыю самаго прадукта і яго рэкламнага ўвасаблення. У выніку прэзентуецца рэклама садова-паркавага комплексу, тэхналогіі лекавых прапаратаў, гумовых вырабаў і інш.

У гэтым навучальным годзе ў межах распрацоўкі тэмы "Гэта мая прафесія" студэнтамі 1 курса лесагаспадарчага факультэта, што навучаюцца па спецыяльнасці садова-паркавае будаўніцтва, падрыхтаваны праекты: «Садова-паркавае будаўніцтва: семантыка і сімволіка», «Гісторыя Негарэльскага батанічнага саду», «Экалагічная сцежка «Казка Негарэльскага лесу» і "Батанічная калекцыя Беларусі». Прэзентацыя, як адзін з этапаў праектнай дзейнасці, дае адчуванне завершанасці і запатрабаванасці вынікаў вучэбнай дзейнасці. У

верасні-кастрычніку навучальны працэс для першакурснікаў факультэта лясной гаспадаркі ажыццяўляецца на базе Негарэльскага учэбна-вопытнага лясгаса, на тэрыторыі якога знаходзіцца Негарэльскі батанічны сад. У абароне студэнтамі быў удала спалучаны назапашаны тэарэтычны матэрыял па вывучаемых спецыяльных дысцыплінах, беларускай прафесійнай лексіцы з эксурсіяй па тэрыторыі дэндрарыя і партэрнай частцы батанічнага саду. Сумесная праектная дзейнасць дазволіла студэнтам не толькі ўсвядоміць значнасць калектыўнай работы для атрымання вучэбных вынікаў, але і ўзбагаціць лексічны запас прафесійнай тэрміналогіяй на беларускай мове.

Праектная дзейнасць у навучанні прадстаўляе несумненную каштоўнасць таксама і для выкладчыкаў, таму што пагружэнне студэнтаў у работу над праектам дазваляе інтэнсіфікаваць працэс навучання і, як следства, ахапіць большы аб'ём матэрыялу. Асаблівая значнасць гэтага віду дзейнасці заключаецца ў скіраванасці на павышэнне якасці фарміравання ўніверсальных кампетэнцый, а яго эфектыўнасць залежыць ад правільнага разумення сутнасці праектнага навучання.

Літаратура

1. Дорфман О.В., Чернова О.Е. – Развитие коммуникативной компетенции студентов технических вузов как стратегия обучения эффективной коммуникации // Litera. – 2022. – № 4. – С. 27–35.

2. Бондаревская, Е.В. Теория и практика личностно ориентированного образования / Е. В. Бондаревская. – Ростов-на-Дону, 2000. – 352 с.